Падтрымай "Вясну" на PATREON

У рэгіёнах працягваюцца суды “за Дзень Волі” дапоўнена

26.03.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Напярэдадні Дня волі па ўсёй краіне прайшлі затрыманні актывістаў. 26 сакавіка над многімі адбыліся суды ў рэгіёнах.

У Салігорску 24 сакавіка быў затрыманы сябра Руху “За Свабоду” **Уладзімір Шыла.** На яго быў складзены пратакол па арт. 23.4 КаАП Рэспублікі Беларусь (непадпарадкаванне патрабаванням міліцыі). 26 сакавіка актывіст атрымаў штраф памерам 3 базавыя велічыні.

У **Магілёве** напярэдадні Дня Волі быў затрыманы сябра аргкамітэта па стварэнню Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) **Станіслаў Паўлінковіч.** Днём 25 сакавіка маці актывіста Наталля паведаміла аб знікненні сына, які меў намер прыняць удзел у святочных мерапрыемствах у Мінску. Аб месцазнаходжанні сына бацькам стала вядома толькі вечарам, паведамляе мясцовы праваабарончы рэсурс mspring.online. Увесь час ён знаходзіўся ў ізалятары.

26 сакавіка Станіслава Паўлінковіча аштрафавалі за парушэнне правілаў дарожнага руху на 2 базавыя велічыні. Таксама на яго склалі пратакол адміністрацыйнага правапарушэння за непадпарадкаванне патрабаванням міліцыі (арт. 23.4 КаАП Рэспублікі Беларусь). Ленінскі суд Магілёва адклаў разгляд справы актывіста на 2 красавіка, бо ён заявіў хадайніцтва, паводле якога яму неабходны час, каб падрыхтавацца.

У Брэсце адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы ў судзе Ленінскага раёна затрыманага ўвечары 23 сакавіка відэаблогера **Сяргея Пятрухіна.** Паводле ч.3 арт.17.3 КаАП начальнік міліцыі пакараў актывіста штрафам у 8 базавых. Акрамя гэтага, 29 сакавіка суд Ленінскага суду г. Брэста прызнаў блогера Сяргея Пятрухіна вінаватым па арт. 23.4 КаАП і пакараў яго штрафам у памеры 45 базавых велічыняў.

У Дуброўна адбыўся суд над **Наталляй Стрэльчанка,** якая была затрымана 25 сакавіка ў 6 гадзіны раніцы. Суд не пачынаўся да 11:00. Наталлі ў судзе стала кепска, бо яна не ела ад раніцы затрымання. У суд прыехала хуткая дапамога, але фельдшэр заявіў, што не можа забраць яе з суда, таму аказаў медыцынскую дапамогу на месцы. Суд перанеслі. 30 сакавіка суд пакараў па арт. 23.4 КаАП яе штрафам у 8 базавых велічыняў.

Праваабаронцам паведамілі, што ў **Бярозе** актывіста **Аляксандра Кабанава** адпусцілі і суд прызначалі на іншы дзень. Ён быў затрыманы ў суботу 24 сакавіка, і на яго склалі пратакол за ўдзеле ў несанкцыянаванай масавай акцыі працiўнікаў акумулятарнага заводу, якая адбывалася ў Брэсце 18 сакавіка.

Бабруйскім праваабаронцам стала вядома, што пратаколы ў дачыненні да лідэркі мясцовай арганізацыі незалежнага прафсаюза РЭП **Галіны Смірновай** і каардынатаркі аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» па Магілёўскай вобласці **Таісіі Кабанчук** адправілі на дапрацоўку, а іх саміх адпусцілі. Абедзвюх ноч трымалі ў камерах. Актывістак абвінавачваюць па арт. 18.23 КаАП Рэспублікі Беларусь (пераход вуліцы ў неналежным месцы) і па арт. 23.4 КаАП (непадпарадкаванне патрабаванням міліцыі) адпаведна. Бабруйскі аддзел ДАІ пакараў іх штрафамі за парушэнні правілаў дарожнага руху ў адну базавую велічыню кожную.

Віцебскі праваабарончы рэсурс паведамляе, што 26 сакавіка адбыўся суд над актывістам **Міколай Качурцам**, які быў затрыманы 25 сакавіка ў 11.30 раніцы, калі прыйшоў з бел-чырвона-белым сцягам да помніку Альгерду **ў Віцебску**. Ён правёў ноч у ІЧУ. Рашэннем суда Кастрычніцкага раёну г. Віцебска Мікола Качурэц быў прызнаны вінаватым і аштрафаваны на 26 базавых велічыняў за парушэнне заканадаўства аб правядзенні масавых мерапрыемстваў (ч.2 арт. 23.34 КаАП) і на 12 базавых – за непадпарадкаванне службовай асобе (23.4 КаАП). У сукупнасці (суд выкарыстаў частковае сумаванне пакаранняў) атрымаў агульны штраф у памеры 30 базавых велічыняў (735 рублёў). Адабраны сцяг суд вырашыў канфіскаваць.


Таксама ў Віцебску 26 сакавіка быў аштрафаны **Андрусь Кешанюк**, які быў затрыманы каля будынку «Белтэлекам», дзе на Дзень Волі разгарнуў бел-чырвоны-белы сцяг. На яго склалі пратаколы па арт. 23.4 і 23.34 КаАП, на падставе якіх суддзя **Наталля Карабліна** аштрафавала яго на 4 і 6 базавыя велічыні адпаведна.

У Барані атрымаў штраф памерам 22 базавыя велічыні паводле арт. 23.34 КаАП актывіст **Генадзь Шэпелеў.** Радыё Свабода паведамляе,што жыхар Барані быў затрыманы 25 сакавіка ў Воршы. Ён хацеў зрабіць фотаздымак з бел-чырвона-белы сцягам у гарадскім парку каля помніка Уладзіміру Караткевічу. Затрымаўшы Генадзя Шэпелева, супрацоўнікі міліцыі спачатку заявілі, што ён парушыў правілы дарожнага руху, але ў той дзень актывіст перасоўваўся на ровары. Урэшце склалі пратакол за несанкцыянаванае пікетаванне па арт. 23.34 КаАП. Пастанова - штраф у памеры 22 базавыя велічыні.

Праваабаронцы "Вясны" сочаць за адміністрацыйнымі справамі актывістаў, інфармацыя будзе дапаўняцца.

Твитнуть







Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе


У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY